**Раманоўскі, Д.** Галоўны загад выканаў / Д. Раманоўскі // Патрыёт (Ушачы). – 2016. – 13 лют. – С. 1, 4.

# ГАЛОЎНЫ ЗАГАД ВЫКАНАЎ



***Гэта вайна зрабіла няшчаснымі тысячы матуль, а магла зрабіць яшчэ больш. Калі выконваць інтэрнацыянальны доўг у Афганістан накіраваліся старэйшы сын і зяць, Тамара Уласаўна Андрыковіч ужо была сівой. Нібы снег лёг на галаву жанчыны яшчэ раней, бо напачатку васьмідзясятых два гады чакала «з-за рэчкі» меншага сына. «Дарага каштавала мая служба для маці, – успамінае Уладзімір Андрыковіч. –І гэта не ведаючы аб тым, што я быў там паранены. Я, наогул, не хацеў, каб яна ведала, дзе служу, ды толькі сэрца матчына не спадманеш, даведалася. Сям'і нашай пашчасціла, бо мы ўсе ўтрох вярнуліся…».***

Уладзімір Якаўлевіч гартае свежую кнігу «У цяснінах памяці. Лепельчане, удзельнікі вайны ў Афганістане 1979–1989 гг.», выдадзеную ў мінулым годзе. Тут змешчаны аўтабіяграфічныя звесткі і дадзеныя пра яго, бо прызываўся хлопец Лепельскім райваенкаматам. Да гэтага ў 1980 годзе скончыў Дубраўскую школу і накіраваўся бліжэй да родных, на Лепельшчыну – старэйшыя брат і сястра ў гэты час жылі ў Бароўцы і Валодзя ўладкаваўся на працу ў мясцовы санаторый Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі. Перад тэрміновай службай, як і многія яго равеснікі, ад ДТСААФ скончыў курсы вадзіцеляў. Павестку на рукі ён атрымаў 27 сакавіка, а праз два дні транзітам праз Віцебск трапіў у Мар'іну Горку, дзе быў створаны эшалон колькасцю 1700 чалавек і накіраваны ў вучэбку Тэрмеза – тут рыхтавацца да выканання інтэрнацыянальнага доўгу пакінулі дзве трэціх навабранцаў. 9 мая 1982 года механік-вадзіцель прыняў прысягу і амаль праз месяц 8 чэрвеня, з Ашхабада вылецеў у сталіцу Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан.

Дзве гадзіны чакання ў аэрапорце Кабула, дзе размяшчалася мноства часцей абмежаванага кантынгенту савецкіх войск, вырашылі далейшы лёс.

– Сядзелі, чакалі «купцоў», – успамінае Уладзімір Якаўлевіч. – Калі паступіла каманда строіцца, я забыўся рэчавы мяшок. Пакуль вяртаўся назад, амаль усіх хлопцаў разабралі, нікога не засталося. Палкоўнік спытаў: «Дзе ходзіш, баец?» Я растлумачыў, ён усміхнуўся: «Значыць, пойдзеш да мяне ў дэсантна-штурмавую брыгаду!».

Калі хлопцы, на змену якім прыехалі маладыя байцы, пакідалі часць, У. Андрыковіч на ўсё жыццё запомніў словы аднаго:

– Развітваліся, ён аддаў мне свой аўтамат і раптам са слязьмі на вачах сказаў: «Загадваць не маю права, але ўсё ж: дамоў вярніся жывым!».

Калі ўпершыню трапілі пад абстрэл, зразумеў значэнне гэтых слоў. Уладзімір Якаўлевіч здзейсніў дзевяць баявых выхадаў – хадзілі ў рэйды, зачысткі. Не пустыя словы для яго дзяліць скарынку хлеба напалову з сябрам – даводзілася абедаць адным сухаром на дваіх, бо з сабой бралі мінімум прадуктаў, а асноўны груз складаў боекамплект – патроны, гранаты. Між тым верталётаў для папаўнення запасаў харчавання даводзілася чакаць тыднямі.

– На базе знаходзіліся сама болей 10 дзён, – расказвае аб баявых буднях воін-інтэрнацыяналіст. – Цікава, што калі выходзілі на зачыстку мясцовасці ад банд, амаль не сустракалі мірнае насельніцтва, кішлакі пусцелі. Незразумела адкуль, але яны заўсёды ведалі, што мы ідзём.

Ведалі аб гэтым і бандыты. Бывала такое, што і на паўдарозе да кропкі прызначэння пачыналіся абстрэлы. Ад базы адыходзілі і на 150 кіламетраў у Джэлалабадскую цясніну, часцей у бок Баграма, сустракалі караваны баевікоў з боку Пакістана. Ніводнага рэйду не абыходзілася без страт. За два гады службы з 40 чалавек прызыву Уладзіміра Якаўлевіча на дэмабілізацыю з роты адыходзіла толькі трынаццаць чалавек – астатнія або загінулі, або былі камісаваны пасля раненняў. Воін-інтэрнацыяналіст з болем успамінае загінуўшых таварышаў:

– Да гор даязджаеш – унізе застаюцца наводчыкі, карэкціроўшчыкі агню, артылерысты, ды і многія афіцэры не асабліва імкнуліся падымацца насустрач маджахедам, чаго ўтойваць, было і такое. Вельмі паважалі маладога лейтэнанта Эйдзіна, які заўсёды быў побач з байцамі роты, пераадольваў з намі і горныя кручы, і глыбокія цясніны. Старэй за байцоў лейтэнант быў толькі на тры-чатыры гады, бо ў Афганістан трапіў амаль адразу пасля заканчэння ваеннага вучылішча. Таму і неслі яго салдаты пасля ранення 15 кіламетраў на руках, рызыкуючы жыццём і адстрэльваючыся ад бандытаў.

Тады, 8 верасня 1981 года, падчас другога баявога выхаду быў паранены і сам Уладзімір Якаўлевіч, і яго сябар, якога, па словах воіна-афганца, «можна сустрэць толькі на вайне». Міхаіл Уласаў зараз жыве ў Маскве, але пасля раненняў іх шляхі разышліся:

– У Мішы былі прабітыя лёгкае, печань і яго камісавалі. Я атрымаў кантузію і ў жывот асколак міны, які засеў у страўніку: пасля аперацыі, трох месяцаў лячэння ў цэнтральным шпіталі Кабула і месяца водпуску ў роднай Дубраўцы вярнуўся ў сваю часць.

Калі на ліквідацыю караванаў выходзілі ротай ці нават групамі па 30-40 чалавек, то на зачысткі раёнаў, дзе гаспадарылі банды маджахедаў, адпраўлялася ўся брыгада дэсантнікаў, узмоцненая пяхотай, артылерыяй, незаменныя былі і верталёты, штурмавая авіяцыя. Запомніўся Уладзіміру Якаўлевічу адзін выпадак, калі іх калону абстралялі са здавалася б пустога кішлака. Тады ў бой уступіла сістэма залпавага агню «Град» – за лічаныя імгненні сем тон смертаноснага металу з сарака ствалоў ператварылі кішлак у пустынныя каменныя разваліны.

– Першы год службы нас абстрэльваюць, а мы не маем права адкрыць агонь у адказ, – расказвае У. Андрыковіч. – Пакуль камандзір дасць запыт у ваенную акругу, там атрымаюць дазвол з Масквы, маджахеды «растварaліся» сярод скал, а мы заставаліся з забітымі і параненымі таварышамі на руках. Сітуацыя змянілася у 1983 годзе, калі быў атрыманы дазвол на выстрал адказваць выстралам.

Не ўтойвае мужчына, што бывала траплялі пад уласныя абстрэлы, ды і небаявыя страты таксама складалі значную частку ад агульных. Няшчасныя выпадкі здараліся і на базе – у палатцы батарэі гукавой

разведкі ноччу згарэла некалькі чалавек: ля буржуек ставілі на ноч «качагарам» маладога, каб потым з сабой не браць у рэйд, а ён заснуў. «Дзедаўшчына» была наадварот звыкламу паняццю: ва ўмовах баявых дзеянняў вопытныя байцы дапамагалі маладым.

Многія хварэлі цяжкай формай гепатыту – вады практычна не было. Можна, канечне, было ўзяць у арыку, але гэта суправаджалася вялікай рызыкай. Таму кіпяцілі ваду ў палявых кухнях, дабаўлялі вярблюджую калючку і пілі як чай.

Не так страшная была спёка, нават і за 50 градусаў, як афганская зіма. Падчас яе дзённыя тэмпературы даходзілі да плюс 25-30 градусаў, затое ноччу апускаліся ніжэй мінус дзесяці.

Небяспекі можна было чакаць і ад мясцовых жыхароў. Напрыклад, «бача», хлопчык 10 гадоў, прадае апельсіны, якія могуць аказацца і атручанымі, і разам з тым з вінтоўкі з трыццаці метраў трапляе ў пяцікапеечную манету.

– Нам наогул забаранялася браць што-небудзь у мясцовага насельніцтва, – кажа Уладзімір Якаўлевіч. – Але таджыкі з імі размаўлялі – блізкія мовы, культура. Быў выпадак: з узлятаючага самалёта ракета звалілася ў жылы квартал Кабула і мы пайшлі яе шукаць – якім жа было здзіўленне, калі знайшлі нашага «прапаўшага без вестак» таварыша. Ён адпусціў бараду, ажаніўся з мясцовай жанчынай. Аб тым, што потым з ім было, расказваць не хачу…

Ён многае не хоча ўспамінаць, нават і пасля службы. З 10 рэйда радавога Уладзіміра Андрыковіча перад ад’ездам знялі можна сказаць з брані 23 красавіка 1983 года, але ў Афганістане яму давялося затрымацца – было нялётнае надвор’е і ў Ашхабад Уладзімір прыляцеў толькі праз чатыры дні. Адтуль зноў самалётам на Маскву і цягніком на радзіму. У Бароўку Уладзімір вярнуўся на Першамай, але сястра з братам паехалі да бацькоў і, узяўшы таксі, ён памчаў у родную вёску. «Вось так атрымалася, што мяне не чакалі, а сталы былі накрыты», – з усмешкай прыгадвае воін-інтэрнацыяналіст.

Пасля дэмабілізацыі ён шукаў па начах аўтамат, «хадзіў у атаку», таму, каб не траўміраваць бацькоў, паехаў на некалькі год у Сібір, але з цягам часу вярнуўся на радзіму. Зараз Уладзімір Якаўлевіч працуе вадзіцелем аўтабазы райспажыўтаварыства, а за гады жыцця быў і будаўніком, і прыватным прадпрымальнікам. Але дзе б ні ўладкоўваўся і як бы ні складвалася жыццё, заўсёды быў адным з актывістаў раённай арганізацыі воінаў-афганцаў, а той факт, што да гэтага часу пра яго ні разу не пісалі ў прэсе, сціпла патлумачыў: «Асабліва не настойвалі, а сам я не хачу лішні раз успамінаць, бо хоць і не так, як раней, але і праз 33 гады я ноччу бывае “іду ў атаку” і прачынаюся з пачуццём кіслага смаку вады з вярблюджай калючкай».

**Дзмітрый Раманоўскі**